# Раздзел 2. СУЧАСНЫ СТАН, НОВЫЯ ТЭНДЭНЦЫІ І ПАДЫХОДЫ Ў РАБОЦЕ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ У АГРАГАРАДКАХ І СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

*Лозка А. Ю.*,

кандыдат філалагічных навук, дацэнт,
начальнік аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці ДУА «Інстытут культуры Беларусі»

## СУЧАСНАЯ МАДЭЛЬ СЕТКІ КЛУБНЫХ УСТАНОЎ І ІХ МЕТАДЫЧНЫХ СЛУЖБАЎ: тыпалогія і структура

Этапныя змены ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці Беларусі, якія пачаліся ў постсавецкім грамадстве ў пачатку 90-х гг. ХХ ст., выявіліся ў эвалюцыйных зменах традыцыйнай мадэлі клубнай установы. Наступныя гады апрабацыі створанай сістэмы, рэфармавання і аптымізацыі сеткі ўстаноў культуры клубнага тыпу і іх метадычных службаў, прывялі да сучаснай мадэлі ўстаноў культуры. Ідэнтыфікуючы новую мадэль[1], разгледзім яе ў рэчышчы структурнай будовы, тыпалогіі.

***Тыпалогія*** клубных устаноў падлягае разгляду па розных відавых і тэматычных прынцыпах. Прапануем варыянт класіфікацыі на аснове «Палажэння аб клубнай установе ў Рэспубліцы Беларусь» [1, *166—172*] і існуючых распрацовак [2], паглыбіўшы і ўдасканаліўшы асобныя палажэнні.

1. *Па адносінах да форм уласнасці*:
   дзяржаўныя;
   прыватныя.
2. *Па характару фінансавага гаспадарання*:
   бюджэтныя ўстановы;
   камерцыйныя ўстановы;
   установы змешанага тыпу фінансавага гаспадарання.
3. *Па ведамаснай прыналежнасці*:
   Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь;
   Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі;

[1] Мадэль створана ў рамках выканання ДУА «Інстытут культуры Беларусі» навукова-даследчай работы «Распрацаваць мадэль сеткі ўстаноў культуры клубнага тыпу і рэкамендацыі па ўдасканаленню метадычнай дзейнасці» (навуковы кіраўнік — А. Ю. Лозка, начальнік аддзела традыцыйнай культуры і аматарскай творчасці, кандыдат філалагічных навук, дацэнт).

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь:

цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі;

клубы адукацыйных устаноў (універсітэтаў, каледжаў і інш.);

клубы па месцы жыхарства;

прыватныя клубныя ўстановы (інтэрнэт-клубы, інтэрнэт-кавярні, дыска-клубы, караоке-клубы, начныя клубы і інш.).

4. *Па адміністрацыйна-тэрытарыяльнай прыналежнасці*:

раённыя дамы (цэнтры) культуры;

гарадскія палацы і дамы (цэнтры) культуры;

гарпасялковыя дамы (цэнтры) культуры;

сельскія дамы (цэнтры) культуры;

сельскія клубы;

аўтаклубы.

5. *Па спецыялізацыі, заснаванай на характары дзейнасці*:

перасоўныя (аўтаклубы);

стацыянарныя.

6. *Па колькасці профіляў дзейнасці*:

аднапрофільныя (адзін кірунак ці від сацыякультурнай дзейнасці — дамы рамёстваў, ганчара, цэнтры ткацтва і інш.);

шматпрофільныя (культурна-творчая, асветная з markednymi кірункамі, формамі, відамі і жанрамі арганізацыі вольнага часу:

установы ўніверсальна-комплекснага характару (палацы, цэнтры, дамы культуры, сельскія клубы і інш.);

установы, якія сумяшчаюць клубную дзейнасць з асветнай і адукацыйнай (цэнтры эстэтычнага выхавання дзяцей, цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, спартыўна-эстэтычныя цэнтры і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці са спартыўнай (культурна-спартыўныя цэнтры і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з сацыяльнымі паслугамі (дамы сацыяльна-культурных паслуг, культурна-дзелавыя цэнтры і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з гандлёвай (клубы-кавярні і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з бібліятэчнай (клубы-бібліятэкі, бібліятэкі-клубы, цэнтры літаратуры і вольнага часу і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з музейнай (клубы-музеі і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з народна-творчай (установы традыцыйнай культуры, народнай творчасці, фальклору, рамёстваў, нацыянальных культур і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з турыстычнай (турыстычныя дамы, гісторыка-турыстычныя цэнтры і інш.);

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з гістарычна-краязнаўчай (культурна-гістарычныя комплексы, клубы фальклору і краязнаўства і інш.);



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сумяшчэнне клубнай дзейнасці з экалагічнай (эколага-культурныя цэнтры);
сумяшчэнне клубнай дзейнасці з тэхнічнай творчасцю (цэнтры тэхнічнай творчасці і інш.).

7. *Па ўзроставаму падзелу*:
установы для дзяцей і моладзі (дзіцячыя цэнтры культуры, цэнтры дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, цэнтры адпачынку моладзі, студэнцкія клубы і інш.);
установы для пенсіянераў і ветэранаў (дом пенсіянераў, палац ветэранаў і інш.).

8. *Па гендэрнай прымеце*:
установы для жанчын;
установы змешанага тыпу.

9. *Па часу дзейнасці (сутачны графік работы)*:
дзённыя ўстановы;
начныя ўстановы;
дзённага і начнога графіка работы.

10. *Па прафесійнай і сацыяльна-дэмаграфічнай прыметах*:
клуб інтэлігенцыі, дыскусійны клуб і інш.

11. *Па часу стварэння і функцыянавання*:
установы, якія былі створаны і функцыянавалі да 90-х гг. XX ст.;
установы новага тыпу[2].

12. *Па нацыянальнай прымеце*:
беларускія культурныя ўстановы;
установы адной нацыянальнай меншасці;
установы нацыянальных культур.

Сістэматызацыя клубных устаноў можа мець працяг з пашырэннем прынцыпаў, якія прапануюцца для разгляду.

Для далейшай зручнасці адлюстравання стану ўстаноў культуры прадставім зводную табліцу «Сістэматызацыя клубных устаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь», складзеную на аснове справаздач абласных метадычных службаў, аб'яднаўшы ў асобную групу па прымеце падобнасці і блізкасці асноўных кірункаў іх дзейнасці. Першыя радкі адвядзём для аднапрофільных, затым — для шматпрофільных і для ўстаноў універсальна-комплекснага характару: гэтыя катэгорыі нельга вылучыць на падставе назваў клубаў, а толькі пасля правядзення аналізу іх фактычнай дзейнасці.

---

[2] Клубныя ўстановы, якія ствараліся згодна з Палажэннем Міністэрства культуры Беларускай ССР «Агульныя прынцыпы дзейнасці дзяржаўных клубных устаноў», зацверджанага адпаведна загаду ад 01.11.1991 г. [3, *5—12*].



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Табліца*

Сістэматызацыя клубных устаноў Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь
(па стану на 01.10.2015)

| № п/п | Назва клубнай установы | Колькасць клубных устаноў па абласцях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Брэсцкая | Гродзенская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гомельская | Мінск | Усяго |
| 1 | Дамы (цэнтры, сектары) рамёстваў, цэнтры народных мастацкіх рамёстваў, аддзелы рамесніцкай дзейнасці дамоў рамёстваў | 11 | 7 | 19 | 14 | 13 | 16 | | **80** |
| 2 | Цэнтры ганчарства, дамы ганчара | 1 | | 1 | | | | | **2** |
| 3 | Цэнтры драўлянай скульптуры | 1 | | | | | | | **1** |
| 4 | Цэнтры ткацтва | | | | | 1 | 1 | | **2** |
| 5 | Дамы майстра | | | | | 4 | 2 | | **6** |
| 6 | Цэнтры (дамы) фальклору | 10 | 2 | 6 | 4 | 5 | 6 | | **33** |
| 7 | Цэнтры (дамы) народнай (нацыянальнай, традыцыйнай) творчасці (культуры), дамы мастацкай самадзейнасці, цэнтры народнага танца, музыкі і песні | 7 | 4 | 16 | 5 | 10 | 50 | | **92** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працяг табл.*

| № п/п | Назва клубнай установы | Колькасць клубных устаноў па абласцях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Брэсцкая | Гродзенская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гомельская | Мінск | Усяго |
| 8 | Цэнтры (дамы) народнай (нацыянальнай, традыцыйнай) творчасці (культуры) і адпачынку (культуры) | 4 | 13 | 1 | 17 | 2 | 4 | | **41** |
| 9 | Цэнтры (дамы, клубы) культуры і вольнага часу | 18 | 95 | 7 | 29 | 59 | 57 | | **265** |
| 10 | Культурна-краязнаўчыя цэнтры | | 1 | | | | | | **1** |
| 11 | Цэнтры (дамы) рамёстваў і (традыцыйнай) культуры, дамы культуры і народных рамёстваў, сектары рамёстваў і ДПМ | | 3 | 1 | 2 | | 2 | | **8** |
| 12 | Дамы (цэнтры) рамёстваў і фальклору | | | 1 | | | | | **1** |
| 13 | Дамы нацыянальных культур, цэнтры рамёстваў і нацыянальных культур | | 1 | 1 | | | 1 | | **3** |
| 14 | Дамы (цэнтры, аддзелы) тэатральнай творчасці | | 2 | | | | | | **2** |
| 15 | Цэнтры эстэтычнага выхавання | | | | | 1 | | | **1** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Працяг табл.*

| № п/п | Назва клубнай установы | Колькасць клубных устаноў па абласцях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Брэсцкая | Гродзенская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гомельская | Мінск | Усяго |
| 16 | Аддзелы (сектары) культурна-масавай і асветнай работы | | 11 | | | | | | **11** |
| 17 | Дзіцяча-юнацкія спартыўна-эстэтычныя цэнтры | 1 | | | | | | | **1** |
| 18 | Культурна-спартыўныя (аздараўленчыя) цэнтры | | 1 | 3 | 5 | 3 | 11 | | **23** |
| 19 | Культурныя гісторыка-турыстычныя цэнтры вёскі, культурна-турыстычныя цэнтры | | 1 | 1 | | | | | **2** |
| 20 | Эколага-культурныя цэнтры | | | | | | 3 | | **3** |
| 21 | Культурна-гістарычныя комплексы | | | 1 | | | | | **1** |
| 22 | Маладзёжныя цэнтры (культуры) | 2 | 4 | | 2 | 5 | 2 | | **15** |
| 23 | Дзіцячыя цэнтры культуры | | | | | 1 | | | **1** |
| 24 | Дамы сацыяльных паслуг | 17 | | | | | 1 | | **18** |
| 25 | Сацыяльна-культурныя цэнтры, дамы сацыяльна-культурных паслуг | | 1 | 1 | 4 | 3 | 2 | | **11** |

*Працяг табл.*

| № п/п | Назва клубнай установы | Колькасць клубных устаноў па абласцях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Брэсцкая | Гродзенская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гомельская | Мінск | Усяго |
| 26 | Цэнтры культуры і быту | | | | | 1 | 1 | | **2** |
| 27 | Культурна-дзелавыя цэнтры | | | 1 | | | | | **1** |
| 28 | Клубы-бібліятэкі | 11 | 6 | 30 | 24 | 50 | 60 | | **182** |
| 29 | Цэнтры літаратуры і вольнага часу | | | 2 | | | | | **2** |
| 30 | Клубы-музеі | | 2 | | 3 | | 2 | | **7** |
| 31 | Цэнтры рамёстваў, этнаграфіі і фальклору | | | | | | 1 | | **1** |
| 32 | Этнаграфічныя цэнтры (народнага быту) | | | 1 | | | 2 | | **3** |
| 33 | Аўтаклубы (сектары) | 15 | 2 | 18 | 20 | 15 | 21 | | **91** |
| 34 | Палацы (цэнтры) культуры | 2 | 4 | 6 | 12 | 4 | 14 | 1 | **43** |
| 35 | Цэнтры (дамы) культуры і вольнага часу (адпачынку) | | 2 | 7 | 24 | 47 | 55 | | **135** |
| 36 | Культурна-забаўляльныя комплексы (цэнтры) | | 2 | 1 | | | 1 | | **4** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Заканчэнне табл.*

| № п/п | Назва клубнай установы | Колькасць клубных установаў па абласцях | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Брэсцкая | Гродзенская | Віцебская | Магілёўская | Мінская | Гомельская | Мінск | Усяго |
| 37 | Клубы вольнага часу (адпачынку), філіялы культурнай дзейнасці ў вольны час | | 11 | | | 5 | 2 | | **18** |
| 38 | Гарадскія (гарадскога пасёлка) дамы культуры | 22 | 17 | 322 (РДК, СДК, СК) | 5 | 24 | 240 (РДК, СДК) | | |
| 39 | Раённыя дамы культуры | 1 | | | 5 | 2 | | | |
| 40 | Сельскія дамы культуры | 285 | 22 | | 152 | 259 | | | |
| 41 | Сельскія клубы, клубы сельскіх сустрэч | 122 | 48 | | 123 | 57 | 65 | | |
| 42 | Канцэртныя залы | | 1 | | | | | | **1** |
| 43 | Кінаканцэртныя цэнтры | | | | | | 1 | | **1** |
| 44 | Цэнтры цыркавога мастацтва | | | | | | 1 | | **1** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На сённяшні дзень сетка метадычных установ уключае 6 абласных метадычных цэнтраў народнай творчасці і культурна-асветнай работы (абласны ўзровень) і г. Мінска (ДУ «Мінскканцэрт»); 122 метадычныя службы раённага ўзроўню (арганізацыйна-метадычныя цэнтры, метадычныя аддзелы (сектары) раённых і гарадскіх дамоў (цэнтраў) культуры); на мясцовым узроўні — больш за 3 тысяч клубных установ.

*Схема 1*

Структурная мадэль
метадычнай сеткі ўстаноў культуры клубнага тыпу

| АБЛАСНЫ ЎЗРОВЕНЬ |
| --- |
| Галоўныя ўпраўленні ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі абласных (Мінскага гарадскога) выканкамаў |
| Абласныя цэнтры народнай творчасці (грамадска-культурны цэнтр), Мінскканцэрт |

| РАЁННЫ (ГАРАДСКІ) УЗРОВЕНЬ |
| --- |
| Аддзелы ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі раённых (гарадскіх) выканкамаў |
| Арганізацыйна-метадычныя цэнтры, метадычныя аддзелы (сектары) раённых і гарадскіх дамоў (цэнтраў) культуры |

| МЯСЦОВЫ ЎЗРОВЕНЬ |
| --- |
| Установы клубнага тыпу |

Асаблівай разнастайнасцю вызначаюцца не толькі клубныя ўстановы, але і іх раённыя аб'яднанні разам з метадычнымі службамі, што маюць сваю мадэль у кожнай вобласці.

Па стану на 01.10.2015 г. у *Гродзенскай вобласці* налічваюцца 28 устаноў са статусам юрыдычнай асобы, што падпарадкаваны адпаведным выканаўчым камітэтам, у тым ліку адна ўстанова змешанага тыпу — Гродзенскі раённы культурна-інфармацыйны цэнтр (далей ГРКІЦ), як метадычная ўстанова з 5 унутранымі аддзеламі, сектарам «Аўтаклуб» і 18 філіяламі, што размешчаны ў населеных пунктах (цэнтры культуры і народнай творчасці, дамы фальклору, культурна-турыстычны цэнтр, дом культуры і г.д., якія падпарадкаваны адпаведным аддзелам ГРКІЦ).

Раённая структура ўстаноў выглядае наступным чынам: раённы цэнтр культуры і народнай творчасці, цэнтры культуры, народнай творчасці і рамёстваў,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

якія маюць адміністрацыйна-кіраўнічыя і гаспадарчыя службы, аддзелы і сектары, якім у сваю чаргу падпарадкаваны ў вёсках аддзелы і сектары (клубы-бібліятэкі, клубы-музеі, раённыя цэнтры рамёстваў і г.д.), а таксама філіялы, дамы фальклору, клубы, раённыя клубы (цэнтры) рамёстваў, цэнтры культуры і адпачынку, якія маюць у структуры філіялы (дамы культуры, клубы-бібліятэкі, канцэртная зала, культурна-забаўляльны цэнтр).

Такім чынам у вобласці: дамоў (цэнтраў) рамёстваў — 2; гарадскіх дамоў (цэнтраў) культуры (культуры і адпачынку, культуры і вольнага часу) — 5; палацаў культуры — 2; маладзёжны цэнтр культуры — 1; культурна-забаўляльны цэнтр — 1; раённых цэнтраў культуры, раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, цэнтраў культуры і вольнага часу — 15, у структуры якіх уваходзяць 291 падраздзяленне, з іх з’яўляюцца аддзеламі (сектарамі) рамёстваў і традыцыйнай культуры — 16, аддзеламі, сектарамі, філіяламі і іншымі ўстановамі клубнага тыпу — 275.

Сістэма метадычных устаноў вобласці адрозніваецца ад іншых рэгіёнаў тым, што былыя клубы перайменаваны ў аддзелы, сектары і філіялы, якія падпарадкоўваюцца адпаведным аддзелам, сектарам і філіялам раённых метадычных службаў. Да таго ж, не ўсе раёны маюць аднолькавую структуру: у некаторых клубы адсутнічаюць, няма філіялаў, сектараў. Напрыклад, Бераставіцкі раённы цэнтр культуры і народнай творчасці мае філіялы па культурнай дзейнасці ў вольны час у 10-ці аграгарадках і 2 сельскія клубы; Ваўкавыскі — аддзелы ў 9-ці вёсках і аграгарадках, філіялы ў 13-ці сельскіх клубах і палацах; Дзятлаўскі — аддзелы ў 7-мі дамах культуры, сектары ў 3-х дамах культуры, сектары ў 4-х клубах вёсак і аграгарадкоў, 1 дом фальклору ў вёсцы і г.д.

У *Магілёўскай вобласці* раённыя клубныя ўстановы аб’яднаны ў 21 цэнтралізаваную клубную сістэму (далей ЦКС), дзе маюцца метадычныя службы. Не ўваходзяць у іх толькі гарадскія клубы, палацы, цэнтры. ЦКС добра апрабавана ў Расіі.

У *Мінскай вобласці* ўсяго 521 клубная ўстанова. Па-сутнасці, у кожным рэгіёне сфарміраваўся адметны тып сістэмы клубных устаноў са сваімі ўзаемасувязямі, службамі метадычнага і адміністрацыйнага падпарадкавання. Функцыянуюць 3-ы цэнтралізаваныя клубныя сістэмы (Барысаўскі, Валожынскі і Маладзечанскі раёны) па магілёўскаму тыпу. Некаторыя раёны стварылі сістэмы па гродзенскаму тыпу. Напрыклад, у Дзяржынскім раёне маецца Дзяржынскі ГДК, Дом культуры п. Энергетыкаў, Фаніпальскі ГДК і Дзяржынскі цэнтр культуры і народнай творчасці з 6 сектарамі культуры і вольнага часу (Валмянскі ДК, Лагавішчанскі клуб і інш.), 10 аддзеламі культуры і вольнага часу (ДК, цэнтры культуры і вольнага часу, аддзел рамеснай дзейнасці Станькаўскі дом майстроў) і 4 філіяламі. Акрамя таго, у вобласці дзейнічаюць 3 ранейшыя метадычныя службы — Вілейскі раённы метадычны цэнтр народ-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

най творчасці і культурна-асветнай работы, Мядзельскі раённы арганізацыйна-метадычны цэнтр і Смалявіцкі раённы арганізацыйна-метадычны цэнтр. У астатніх раёнах метадычныя службы перанесены ў розныя ўстановы клубнага тыпу, напрыклад, Культурны цэнтр вольнага часу Салігорскага раёна, Раённы цэнтр культуры і адпачынку г. Старыя Дарогі, Слуцкі раённы цэнтр народнай творчасці і інш.

У *Брэсцкай вобласці* працуе 531 установа клубнага тыпу, у тым ліку 5 юрыдычных асоб. Усе раёны, акрамя Бярозаўскага, захавалі ранейшыя метадычныя службы (арганізацыйна-метадычныя, метадычныя цэнтры). У раёне 5 дзяржаўных устаноў культуры — дамы культуры, цэнтр рамёстваў і спартыўна-эстэтычны цэнтр, а таксама Бярозаўская раённая клубная сістэма, якая складаецца з філіялаў (16 СДК, 8 СК, 1 цэнтр культуры і вольнага часу і 1 аўтаклуб).

Клубныя ўстановы *Віцебскай вобласці* аб'ядноўваюць 40 юрыдычных асоб: 19 дамоў і цэнтраў рамёстваў (цэнтраў рамёстваў і традыцыйнай культуры), 16 дамоў і цэнтраў культуры, 332 сельскіх (гарадскіх, раённых) клубы (дамы) культуры, 18 аўтаклубаў, 1 раённы метадычны цэнтр, 3 цэнтралізаваныя клубныя сістэмы (Браслаўская, Лёзненская і Міёрская). Глыбоцкі раённы цэнтр традыцыйнай культуры і народнай творчасці мае толькі філіялы (11 дамоў культуры, 5 сельскіх клубаў і па аднаму культурнаму гісторыка-турыстычнаму цэнтру, дому фальклору, культурна-спартыўнаму цэнтру, дому рамёстваў). Падобная структура і ў Цэнтры традыцыйнай культуры і народнай творчасці Докшыцкага раёна.

Асаблівай структурай вызначаюцца ўстановы Аршаншчыны. У г. Орша захаваўся раённы вучэбна-метадычны цэнтр. Не маюць сваіх структур Аршанскі дом рамёстваў і Аршанскі раённы цэнтр народнай творчасці і рамёстваў г.п. Копысь, іх утрымліваюць Гарадскі палац культуры «Орша» (2 клубы-бібліятэкі, 3 дамы культуры і 1 сельскі клуб), Аршанскі гарадскі цэнтр культуры «Перамога» (1 аўтаклуб, 2 сельскія клубы, 4 дамы культуры), Аршанскі раённы дом культуры, Палац культуры г. Барань Аршанскага раёна, Дом культуры г.п. Балбасава Аршанскага раёна.

*Гомельская вобласць*, у складзе якой 21 раён і г. Гомель, мае 571 установу культуры, у тым ліку Цэнтралізаваную клубную сістэму Веткаўскага раёна і Ельскі раённы цэнтр арганізацыі вольнага часу насельніцтва і метадычнай работы. Метадычныя аддзелы іншых раёнаў уваходзяць у склад адпаведных устаноў культуры клубнага тыпу. У абласным цэнтры функцыянуюць палац культуры і 4 дамы культуры, якія падпарадкоўваюцца Гомельскаму гарадскому арганізацыйна-метадычнаму цэнтру.

Такім чынам, розныя формы арганізацыі метадычных службаў (арганізацыйна-метадычныя цэнтры, метадычныя аддзелы ці сектары раённых і гарадскіх дамоў або цэнтраў культуры і інш.) і аб'яднанняў клубных устаноў у рэгіёнах краіны

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

(цэнтралізаваныя клубныя сістэмы, арганізацыйна-метадычныя цэнтры, раённыя цэнтры народнай творчасці і інш.), што адлюстроўваюць адзінства прынцыпаў, кірункаў, механізмаў і метадаў узаемадзеяння паміж сабой, уяўляюць сабой структурную сістэму.

Разам з тым адчуваецца паслабленне метадычных сувязяў у асобных гарадах, дзе адсутнічаюць адпаведныя аб'яднаныя метадычныя службы і клубныя ўстановы (а іх бывае 2—3 і больш) дзейнічаюць паасобку. Іх дзейнасць адпаведным чынам у статуце ўстаноў не закладзена.

Эфектыўнасць метадычных службаў палепшыцца, калі будзе сфарміравана комплексная сістэма шматбаковага міжрэгіянальнага супрацоўніцтва абласных метадычных цэнтраў, устаноў культуры і адукацыі сферы культуры, органаў мясцовага самакіравання шляхам абагульнення, папулярызацыі і прадстаўлення перадавога вопыту работы, правядзення сумесных мерапрыемстваў па ўдасканаленню дзейнасці, звязанай з ажыццяўленнем і забеспячэннем работы ўстаноў сферы культуры: створаны інавацыйныя пляцоўкі як асновы для дыялогу і абмену вопытам у сферах народнай творчасці, захавання культурных традыцый і культурна-асветнай дзейнасці шляхам падтрымкі і рэалізацыі паспяховых рэгіянальных праектаў; сістэмнае павышэнне прафесійнага ўзроўню кадраў сферы культуры шляхам удзелу ў мерапрыемствах у галіне дадатковай адукацыі дарослых і інш.

Патрабуецца сістэмная мадэрнізацыя клубнай дзейнасці і іх метадычнага забеспячэння па асобных прынцыпах, кірунках, падцягванне ўсіх клубных устаноў да ўзроўню лепшых, перспектыўных.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Палажэнне аб клубнай установе ў Рэспубліцы Беларусь // Сморгович, И. Л. Основы культурно-досуговой деятельности : учеб.-метод. пособие / И. Л. Сморгович ; Мин-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. — Минск : БГУКИ, 2013. — С. 166—172.

2. Макарава, А. А. Клубныя ўстановы як суб'ект рэалізацыі прыярытэтаў дзяржаўнай культурнай палітыкі / А. А. Макарава // Веснік Беларус. дзярж. ун-та культуры. — 2003. — № 2. — С. 89—96.

3. Нормативно-правовые акты Республики Беларусь в сфере культуры / сост. О. М. Захорошко. — Минск : БелИПК, 1996. — 99 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ